УДК 581.526.3

Л. М. САПЕГІН

УПЛЫЎ МІНЕРАЛЬНЫХ УГНАЕННЯЎ НА САСТАЎ І ПРАДУКТЫЎНАСЦЬ МІКРАГРУПОВАК СЕЯНАЙ СЕНАЖАЦІ ПОЛЬДЭРА

Асушальная меліярацыя ў поймах рэк звязана з будаўніцтвам польдэраў, дзе на месцы прыроднай нізкапрадукцыйнай расліннасці ствараюць сеяныя сенажаці і пашы.

Зімовы польдэр «Пакалюбічы» (калгас імя Леніна Гомельскага раёна) пабудаваны ў 1982 г. на плошчы 1313 га. Тэхналогія стварэння і выкарыстання сеянай сенажаці польдэра разгледжана намі раней [2].

На працягу двух гадоў (1988—1989) мы вывучалі ўплыў мінеральных угнаенняў на склад і прадуктыўнасць мікрагруповак сеянай сенажаці.

Глеба сенажаці польдэра тарфяна-балотная маламагутная; торф нізінны, асакова-драўняны, ступень раскладання 40%, зольнасць 17,5%,

Табліца 1. **Метэаралагічныя ўмовы вегетацыйнага перыяду (паводле даных Гомельскага цэнтра па гідраметэаралогіі)**

Месяц	Год		Сярэднешматгадовыя
	1988	1989	
Красавік	7,1 / 25	9,3 / 34	6,3 / 42
Май	15,2 / 52	14,9 / 41	13,7 / 53
Чэрвень	18,3 / 137	19,4 / 82	17,2 / 76
Ліпень	21,3 / 59	18,8 / 39	18,7 / 79
Жнівень	17,3 / 60	18,4 / 37	17,7 / 68
Верасень	13,1 / 69	14,1 / 22	12,6 / 51
Сума ападкаў, мм	412	255	368

Заўвага. У лічніку — тэмпература паветра, °С, у назоўніку — сума ападкаў, мм.

pH_{KCl}6,0, P_2O_5 — 19,0, K_2O — 50,8 мг на 100 г глебы. Узровень грунтавых вод падтрымліваецца на глыбіні 80—90 см.

У 1988 г. у травастоі, акрамя сеяных злакаў (Festuca pratensis Huds., Phleum pratense L., Dactylis glomerata L., Bromopsis inermis (Leys.) Holub), былі віды-апафіты Alopecurus pratensis L., Poa palustris L., Poa pratensis L., Agrostis gigantea Roth, Deschampsia cespitosa (L.) Beauv., Trifolium repens L., Vicia cracca L., Lathyrus palustris L., Lathyrus pratensis L. і некаторыя віды групы разнатраўя з апафітаў і антрапахораў — усяго 34 віды.

Агульнае праектыўнае пакрыццё травастоем па гадах назіранняў вагалася ад 80 да 90%, вышыня 60 (100) см. Склад травастою разнастайны. Устойлівымі дамінантамі былі метлюжок балотны (Poa palustris L.), каласоўнік безасцюковы (Bromopsis inermis (Leys.) Holub), казялец паўзучы (Ranunculus repens L.), няўстойлівымі — лісахвост лугавы (Alopecurus pratensis L.), цімафееўка лугавая (Phleum pratense L.).

Сінтаксанамічны дыягназ [4—7] сеянай сенажаці на працягу двух гадоў быў аднолькавы. Ён адносіўся да класа Molinio-Arrhenatheretea, парадку Molinietalia, саюзу Molinion, асацыяцыі Poo palustris-Alopecuretum pratensis var. Bromopsis inermis.

Метэаралагічныя ўмовы гадоў назірання былі неаднолькавымі (табл. 1). У 1988 г. вегетацыйны перыяд быў цёплым і вільготным, а ў 1989 г.— цёплым і сухім.

З мэтай вывучэння ўплыву мінеральных угнаенняў на прадуктыў-

Табліца 2. **Уплыў мінеральных угнаенняў на склад і прадуктыўнасць мікрагруповак сеянай сенажаці польдэра (1988 г.)**

Група і від раслін	Мікрагрупоўкі з пераважаннем							
	лісахвосту лугавога		вострыцы дзірваністай		канюшыны паўзучай		крыні чніку даўгалістага	
	А	Б	А	Б	А	Б	А	Б
Усе расліны	894,0 / 100,0	1559,7 / 100,0	1017,3 / 100,0	1496,2 / 100,0	703,2 / 100,0	853,6 / 100,0	609,1 / 100,0	654,8 / 100,0
Злакі	842,4 / 94,2	1453,8 / 93,2	920,9 / 90,5	1404,3 / 93,8	412,3 / 58,7	523,3 / 61,3	226,1 / 37,1	144,4 / 25,0
Poa palustris	159,1 / 17,8	108,0 / 6,9	43,5 / 4,3	128,0 / 8,5	180,3 / 25,7	150,4 / 17,6	129,0 / 21,2	76,0 / 11,6
Deschampsia cespitosa	59,7 / 6,7	35,7 / 2,2	610,0 / 60,0	1007,0 / 67,3	30,2 / 4,3	70,0 / 8,2	63,1 / 10,3	38,4 / 5,2
Alopecurus pratensis	510,0 / 57,0	1264,0 / 81,0	153,2 / 15,0	161,6 / 10,8	150,1 / 21,4	180,2 / 21,1	—	—
Сеяныя злакі	113,6 / 12,7	46,1 / 2,9	114,2 / 11,2	107,7 / 7,2	51,7 / 7,3	122,7 / 14,4	34,0 / 5,6	30,0 / 4,6
Festuca pratensis	30,8 / 3,5	25,4 / 1,6	72,0 / 7,1	33,2 / 2,2	42,1 / 5,9	98,2 / 11,6	34,0 / 5,6	30,0 / 4,3
Phleum pratense	63,0 / 7,0	11,4 / 0,7	42,2 / 4,1	60,5 / 4,1	9,6 / 1,4	14,0 / 1,6	—	—
Bromopsis inermis	19,8 / 2,2	9,3 / 0,6	—	14,0 / 0,9	—	10,5 / 1,2	—	—
Бабовыя	4,4 / 0,5	34,0 / 2,2	34,2 / 3,4	22,1 / 1,5	212,6 / 30,2	260,1 / 30,5	17,7 / 2,9	8,9 / 1,4
Vicia cracca	1,6 / 0,2	27,6 / 1,8	34,2 / 3,4	22,1 / 1,5	20,4 / 2,9	14,0 / 1,7	17,0 / 2,8	7,0 / 1,1
Trifolium repens	2,8 / 0,3	6,4 / 0,4	—	—	192,2 / 27,3	246,1 / 28,8	0,7 / 0,1	1,9 / 0,3
Разнатраўе	47,2 / 5,3	71,9 / 4,6	62,2 / 6,1	69,8 / 4,7	78,3 / 11,1	70,2 / 8,2	365,3 / 60,0	501,5 / 76,6
Leontodon autumnalis	18,0 / 2,0	18,0 / 1,2	22,1 / 2,2	28,2 / 1,9	18,0 / 2,6	30,4 / 3,6	6,4 / 1,1	16,6 / 2,5
Ranunculus repens	18,0 / 2,0	39,0 / 2,5	22,1 / 2,2	24,4 / 1,6	14,1 / 2,0	9,0 / 1,0	—	—
Cnidium dubium	1,2 / 0,1	7,0 / 0,4	11,0 / 1,1	10,6 / 0,7	16,6 / 2,4	10,0 / 1,2	—	3,0 / 0,5
Veronica longifolia	2,7 / 0,3	6,0 / 0,4	—	—	6,0 / 0,8	5,4 / 0,6	340,0 / 55,8	470,1 / 71,8
Achillea millefolium	2,8 / 0,4	1,4 / 0,1	—	—	0,9 / 0,1	3,1 / 054	10,0 / 1,7	—
Stellaria palustris	1,0 / 0,1	0,3 / 0,0	—	—	3,6 / 0,5	—	2,0 / 0,3	5,6 / 0,9
Rumex thyrsiflorus	1,9 / 0,2	0,2 / 0,0	1,6 / 0,1	—	9,0 / 1,3	5,2 / 0,6	3,4 / 0,6	1,6 / 0,2
Coronaria flos-cuculi	—	—	5,4 / 0,5	6,6 / 0,5	—	—	2,0 / 0,3	4,6 / 0,7